Беларускі шлях

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраулядь перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Менску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 55. Менск. Пятніца 31 мая 1918 г. Год I

Абвестка.

Канцэлярыя Нямецкаго Граданачальніка пераводзіцца 1-го чэрвеня гэт. року у дом № 14 на Падгорнай вуліцы.

У гэты дзень заняцця праізводзіцца ні будзе.

Менск 31/V.

Тэлеграммы з Кіеву ад 24 гм. прынесьлі цікавую і надта важную для Беларуска-Вялікарускіх стасункау вестку:

На першым пасядзэнні пленума Украінска-Вялікарускай мірнай конфэранцыі 23 мая у Кіеві, маршалэк украінскай дэлегацыі Шэйнекін запытауся ад імені якіх замель будзе гаварыць Вялікаруская дэлегацыя, бо Беларусь, Сыбір, Дон і Кауказ ні прызнаюць уласьці савецкаго ураду.

Атказ галавы Вялікарускай дэлегацыі, што гэта—унутрэная справа Расіі, ні здаволу украінцау і на пасядзэнні свайім 24 мая украінская дэлегацыя зажадала яснай формуліроукі паунамоцніцтвау Вялікарускай дэлегацыі з акуратным абазпачэннем земель, ад імені каторых яна будзе прамауляць. На гэтым пасядзэнне прыпынено.

Большэвіцкія «міратворцы» ні першы раз чуюць ужо гэтае запытанне—ад чыйго імені яны прамауляюць. Такое пытанне ставілося ім і на Берасьцейскай мірнай конфэрэнцыі, толькі што справа гэтая ні разглядалася тамака асобна і прынцыпіяльна.

Бо і у самой рэчы ні можа быць ні цікавым для стараны, уступаючай у перагаворы з большэвікамі пытанне каго яны рэпрэзэнтуюць.

Возьмем хаця бы даны выпадак—перагаворы Украінска-Вялікарускія. У той час, калі сама Украіна знайходзіцца у найлепшых стасунках з Цэнтральнымі дзержавамі і карыстае з іх помачы, калі Беларусь шукае добра-суседскіх зносін з Намеччынай а Кауказ Доя—поудзенна-заходняя фэдэрацыя—знайходзяцца у пэрыодзе наладжевання згоды с Турцыяй—калі усе гэтыя народы і краі так ці іначэй хіляцца да Цэнтральных дзержавау і іх хаурусьнікау, Сыбір гатова падзегчы амэрыканска-японскім уплывам, і найсьці на хаурус з гэтымі дзержавамі, каторыя спрауней забезпечаць ей усе чаго ні давала Сыбіры Вялікаросія а найперш за усе упутраны спакой. Закаспійская обласьць і Туркестан так сама ні могуць лічыцца безпрэчна падлежаючымі яе уплыву. Іш:э восень 1917 году прынесла адтуль весткі аб голадзе, каторы захапіу гэтае джэрэло рускай бавоуны. Зіма 1917-1918 году разсказала аб фактах стварэння областного Закаспійскаго ураду, разгоні яго большэвікамі і згвалтаванні сартска-башкірскаго нацыянальнаго руху, саусім у кшталце царскіх «усьмірэнняу». Вясна гэтаго году дала вестку аб тым што Туркестан на далей адмауляецца быць дастаушчыкам бавоуны для Маскоускіх мануфактурыстау. Англія, каторая і да гэтаго мела сюды доступ праз Авганістан, цяпер атрымаушы ад Расіі манаполію я.. свае інтарэсы у Пэрсіі, трэба думаць пастараецца выкарыстаць гэты факт як найлепей і зрабіць магчымым стварэнне Закаспійскай дзержавы пад сваей апекай. Сымпаціі жыхароу будуць у гэтым выпадку на старане тых хто дасьць ім арганізацыю, спакой, а з імі хлеб, а ні з большэвікамі.

Так на далекіх рубяжох. А у самым цэнтру з яго нілічаным чыслом рэспублік, вольных гарадоу сел і нават сельскіх сходау розных орыентацый за і проціу большэвікоу і таго, што яны робяць і ні пералічыць.

Якую ж вагу, якую рэяльную вартасьць могуць мець умовы, каторыя заключаліся-б с прэдстаунікамі рэпрэзэнтуючымі пры даных акалічнасьцях німа ведама каго?—Разумеецца ні якой. І бажанне украінскай дэлегацыі трэба вітаць як дальнавіднае і разумнае. Маладая дзержава ні можа класьці у свой фундамэнт нізагартаванай цэглы. А такой цэглай былаб мірная умова «з ніведамымі людзьмі». Становуае захаванне украінцау на гэтай пазыцыі змусіло-б у канцы імпэрыялістау «соцыялістычнай» рэспублікі зрабіць сьціслейшы рахунак сваім сілам і раз па зауседы абвесьці свае рубяжы.

Мы—беларусы можам вітаць гэтую настанову і з другой прычыны: яна дае нам іпічэ раз магчымасьць выступіць як асобная сіла на міжнародным пляцу.

Проба беларускаго ураду—Выканаучаго Камітэту 1 Агульна беларускаго зьезду мець сваіх прэдстаунікоу на Берасьцейскай конфэрэнцыі і падтрымаць на ей інтарэсы Беларусі ні удалася. Тады так сама рэпрэзэнтанты ні маючай дзержауных граніц большэвізіі казалі што гэта—унутрэнно-руская справа і гэтак зрабілі адвод Беларускай справе.

Цяпер Беларускі Урад павінен настаяць каб інтарэсы Беларусі ні асталися замоучанымі і павінен дабіцца гэтаго экстрэнымі мерамі.

Агульныя весткі.

ЦЮРЫХ 27/V. Газэта «Цюрыхэр Тагэсанцэгер» паведамляе с Скібэрэна. У ірляндзкім графстве Корк выйшлі гарачыя інцыдэнты. Аддзяленне паліцэйскіх часьцей павінно было арэштаваць Дрысколля, прэзыдэнта партыйнаго камітэту, аднак-жа было спатканo рэвальвэрнымі выстрэламі. Дом прэзыдэнта прэтварыўся у фартэцыю, так што паліцыя была прымушэна прыступіць к асадзе. 6 чалавек арэштовано. Дрысколль нібы то схваўся.

ФРАНКФУРТ на МАЙНЕ, 27/V. Як паведамляець газэта «Матэн», Керэнскі прыбыў на скандынаўскім параходзе у адзін Канадзкі порт.

АМСТЭРДАМ 27/V. Ангельская белая кніга апублікоувае, што у 1916—17 г. ангельскія дзержаўныя даўгі павялічыліся амаль на суму у 2,000 мільёнау фунтаў стэрлінгаў. Агульная цыфра доўга Англіі за фінансавы 1916—17 г.—4.063,644,981 фунт. стэрлінгаў.

ГААГА, 27/V. Паміж амэрыканскімі тэлеграфнымі служачымі развіваецца моцны рух, маючы забастовачны характар, дзеля таго што, як паведамляюць амэрыканскія газэты, ім забаранілі право сабрання. Упраўленні пацьверджаюць, што рух часьцю мае большэвіцкі характар.

РОТЭРДАМ, 27/V. З Ірляндзії у Лёндане атрымоўваецца вельмі мала вестак. Шмат вялікіх безпарадкаў было у Сэрры, дзе былі канфіскаваны вялікі запас гарачаго ўзброення і ўзброенных прыпасаў. У Стлярні выйшло ўзброеннае сапраціўленне проціў інрляндзкіх констаблей і войска, пры чым з абедзьвух старон было шмат раненых і забітых. У Корцы Сін-фэйнеры падпалілі вялікі склад з амуніцыяй для амэрыканскіх салдатаў. Усе правінцыі усходняй і паўднёвай Ірляндзіі абвешчаны на ваенным становішчы.

КОУНА. «Baltisch-litauiache Mittoilungen» (быўшая Коггеср. В.) наказывае:

Глаўнакамандуючы на Усходзі прынц Леопольд Баварскі пры начальніку упраўлення Об Ост. ф. Фалькенгаўзэну прыняў літоўскіх кіраўнікоў: праф. пралата Ольшэўскас'а і старшыню літоўскай рады Смэтону. Яны высказалі сваю падзяку за вызваленне Літвы і дадзеную летась падмогу 300,000 марак.

На беларускім шляху.

У Радзе Б. Н. Р.

Гэтымі днямі Раду навясьціў прэдстаўнік Койданоўскай Беларускай Рады,—старшыня яе вык. кам. ягом. І. Бурвель, які зрабіў паведамменне Сакрэтарыяту аб чыннасьці Койданоўскай Рады і узяў інформацыі аб стане беларускай справы у абэдны момэнт і інструкцыі для далейшай працы Рады.

— Пазаўчора выехалі з Менску дэлегаты у Раду Б. Н. Р. ад сходу грамадзян Бабруйскаго павету ксёндз А. Астрамовіч і п. Носовіч. Мэта дзеля якой прыбывалі дэлегаты у Менск акрэсьляецца рэцэсам (пратаколам) сходу, копію якога дэлегаты мелі з сабой:

«Пратакол. 1918 году мая 19 дня. Мы, ніжэй падпісанныя, грамадзяне Бабруйскаго павету, сабраўшыеся у памешканні пана Заржэцкаго, у двара Абольцы, пастанавілі: 1) выбрацьпратсядацелям сабрання ксяндза А. Астрамовіча і сэкрэтаром студэнта Кіеўскаго Коммэрцыйнаго Інстытуту п. Носовіча; 2) Паслаць дэлегацыю у Менск для выясне́ння бягучых палітычных спраў Беларусі. Дэлегатамі выбраць кс. А. Астрамовіча і п. Носовіча; 3) Даць дэлегацыі такую праграму:

а) форма ураду, жаданая у Беларусі;

б) урадовая мова;

в) прасіць найвышэйшы Беларускі Урад, каб акраіны Беларусі, што ні уступілі у цяперашні абшар былі як найхутчэй да яе далучаны;

г) Каб у пачатковых школах навучанне вялося у беларускай мові і з беларускіх кнігаў;

д) дамагацца ад Ураду, каб як найхутчэй была устаноўлена краёвая адміністрацыйная ўласьць;

4) выдаць упоўномочання Менскім дэлегатам».

[Подпісы старшыні, пісара і членоў сходу у лічбе 12 асоб].

Беларускі тэатр

У суботу 25 траўня драматычнай сэкцыяй «Беларускай Вучнеўскай Грамады» быў настаўлены сцэнічны абразок у 2 дзеях Т. Гушчы «Антось Лата».

Раней, як пісаць аб ігры артыстаў-вучняў, я павінен з смуткам сказаць, што у апош-

ні час Беларуская Вучнёўская Грамада пачала хіліцца к распаду. Быў я на першым іх сходзе і бачыў як горача бралiся маладыя сілы да працы—працы на ніве адраджэння роднай нам бацькаўшчыны Беларусі. З якімі надзеямі яны узяліся за працу — не першы пачатак! Але ніхват грошы зрабіў тое, што Грамада разбілася на сэкцыі, на драматычную сэкцыю наклала усе надзеі па дабыццю фундушу. Паставілі былі колькі спектакляў і прыціхлі, такім чынам касса Грамады зноў апусьцела. Цяпер дзякуючы А. Андрэяву (Галава Грамады) заджывілася праца драматычнай сэкцыі. А. Андрэяў многа мае карысных думак, але толькі ці ён правядзе іх у жыцьцё?..

Дзеля таго, што ігралі маладыя сілы, яшчэ ні усім добра знаёмыя са сцэнай, мы ні маем права ад іх патрэбаваць праўдзівага сцэнічнага штукарства. Хаця паміж імі есьць шмат здольных як напрыклад: А. Андрэяў (у ролі Антося Латы, ён жэ рэжысэр) Глеб (у ролі шынкара Бэркі) і Сідаровіч (у ролі шынкаркі Лэі) каб яны папалі у рукі добрага рэжысэра, то выкеравaліся-б на добрых артыстаў. Наогул ігралі добра.

Палачанін (у ролі Габруся), Санковіч (у ролі Рыгора) ігралі нічага сабе. Можна толькі закінуць тое, што за надта рабілі тыпаў пьяных, чым перашкаджалі добрай ігре Антося Лата. Калітоўская (1 здань) ігрaла-б добра але я раю лепей вучыцца ролі і ні садзіць расейскіх слоў. Добра трымаліся Сушчынская (2 здань) і Лобаноўскі (нізнаемы).

Наогул трэба падзякаваць гэтым маладым сілам за іх працу і пажадаць каб далей яны ні пакідалі яе. **П.**

Лісты з вескі.

III.

Сягоня да Вас, нашыя паважныя гаспадынькі, зьвертаюся. Да Вас, прыдбаўшых сваёй працавітасцю славу для Літвы беларускімі мёдамі, беларускімі сырамі, беларускай вандлінай. Чаму усё гэтыя прысмакі ахрысьцілі Вы літоўскімі—Вам хіба толькі і ведаць. Я ні зайздрую славе Літвы, як і ні зайздрую смаку літоўцаў, у каторых давялося мне папрабаваць—ні менш слаўнай, нат у прыказках—стравы: гароху с капустай. Хай літоўцам будзе слава, а нам хоць сытасьць.

Чытаючы старадаўныя кронікі аб фастах, якія адбываліся ні у Шаўлях, Коўні, чы нат Вільні а у Міры, Навагрудку і іншых беларускіх замках, ні кажучы ужо аб Несьвіжы,—я заўсёды аблізываюся. Але адным аблізываннем сыт ні будзеш. Ось, дзеля таго і зьвертаюся да Вас, гаспадынькі на Беларусі, каб у сёлетні цяжкі для нас год, вы узялі у свае умелыя, працавітыя ручкі тую частку харчу, якая дагэтуль або саўсім у нас марнавалася, або мала была выкарыстана.

Вам лепш, як каму, знано, што у нас—на Беларусі. пачынаючы ад згону сьнегу, калі на пасеках з'яўляюцца смаршчкі і канчаючы замаразкамі, калі нашы сасновыя узгорачкі чырванеюць іншчэ ад рыжкоў,—праз увесь гэты праміж часу заўсёды нешта знойдзіцца, што так, чы інначай можна выкарыстаць для сьнежарняных запасаў на зіму.

Рабіць іх паводлуг рацэпту знанай кніжкі «gospodyni Litewskiej» (я пераконаны, што сама аўтарка ні толькі ні з Літвы, але на літоўску ні слова ні умела) пэўна ж можна было б з гантальёвага вьеку, але сёлета у нас ніхват як раз тых прыпраў, якіх тыя рацэпты так багата вымагаюць: цукру, масла, мукі і інш. фрыкасаў. Значыцца трэба выдумаць нешта іншае, новае, можа менш смачное, але больш эканомнае. А прыдумываць ёсць с чаго: пачынаючы ад грыбоў, ягад, варыва, фруктаў, рыбы, ракаў, зьвярыны і канчаючы жалудамі.

Мы, напрыклад, добра ведаім смак і сокаў, і канфітур с суніц (паземак), але бадай, ні усім знаны ні толькі вельмі прыемны смак, але і надта здаровы пашітак, за мест гарбаты з гэтых самых—сушоных ягад.

Мне давялося у случыне бачыць у аднаго лясніка чырванюсенькія ад суніц пракосы. На маё пытанне, чаму іх ні зьбірае той атказаў: «ядзім колькі—можым, а на продаж німа куды несьці—надта далёка». I вельмі зьдзівіўся чалавек, калі даведаўся, што гэта ягада сушоная мае вялікую вартасьць і цану у прадажы.

Вартасьць і карысьць сушоных чарніц знаны кожнаму, а тым-часам найбольш носюць іх на продаж свежымі, дзеля чаго траціцца шмат лішняга часу. У Менск носюць і возюць іх за вёрст сорак, дзе гандляры перарабляюць іх на віно. Колькі у Менску такога віна разыходзілося—даведацца можна было б на нашых парафіях. Я сам бачыў у гандляра вином, як ён налівау прыгатаваны, ведомым ім спосабам, чарнічнік у бутэлькі, печатаваў і лізнуўшы языком, наклеіваў этыкетку: «церковное віно. Кагор. Высшій сорт».

Есьць у нас вёскі надта багатыя на вішні. Напрыклад Гайна (менск. пав.). Айнаравічы (здаецца, барыс. пав.) прадаюць вішань на тысячы рублёў. Селета цаны на іх ні будзе, бо віма цукру, а тым мець добры збыт; но вішні могуць ні сушыцца; але трэба іх сушыць на мейсцы.

Ні ведаю, чы можна на зіму рабіць якія запасы з нашых рыб, але мне здаецца, што каб удалося замарынаваць нашыя гаркушкі, а асабліва сліжыкі—мала хіба уступілі б яны у смаку сардынкам, чы кількам, ні кажучы ужо а бычках.

У Пiншчыне і Случчыне давялося мне зімой есьці дзікія качкі ў летку марынаваныя, як іх там называлі. Каму давялося быць у гэтых паветах—на балотах у Пятроўку, калі рулька стрэльбы так нагрэваецца ад стрэлаў па зьвярыне, што дакранутца нельга, той ведае колькі гэтага дабра там можна набіць.

А нашыя жалудзі? Ні кажучы ужо аб карысьці іх для жывёлы, якую смачную і сытную каву можна з іх, дамешаўшы зерня, прыгатаўляць.

I гэта іншчэ малая частка таго, што я ведаю, што я надта мала ведаю.

Дык ось, трэба людзям больш практычным, ніадкладаючы, сабраць, абмазгаваць усё гэта і узяцца да работы.

Мне здаецца, што найпатрабнейшымі і найкарыснейшымі для нас былі б сушарні, наладжаныя па пэўных пунктах, куды аколіца магла б зьбываць ягады, грыбы, фрукты і т. п.

Ні шкодзіла б, я думаю зарганізаваць з добрых паляў, нічых дружыны, а так сама дружыны і рыбаловаў.

Ні адкладна выдаць брашурку на рожных мовах с кароткімі і яснымі парадамі с чаго, у якім часе і як карыстаць, і разаслаць гэту кніжку як найшырэй.

Пазназначаць раіонных інструктарак, чы інструктароў да каторых пэўная аколіца магла б зьвертацца за парадамі.

Ось, на першы пачатак і усё.

Дык—у добры час—за работу—да працы! Каб і самім было што есьці і каб людзей маглі пачаставаць.

Я. Ш.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоунаг[о] камандавання за 29 мая 1918 року.

З А Х А Д: На палёх бітвы ад Іербіса да Уазы пра[цягвалася] падвятая баявая чыннасьць; французкія часткі вы... атакі паудпёвей Іпэрна ні ўдаліся. Захадней Мондідье ніпрыяцель ў мейсцввым націску ўварваўся ў Канціньі.

Арміі генэрал-палкоўніка фон-Бён і генэрала ф. Бело[ва] (Фрыца) групы Нямецкага Кронпрынца пабеданосна пра[]цягвалі ўчарайшы націск, пасьпешаўшыя на падмогу фра[н]цузкія і ангельскія рэзэрвы былі адкінуты.

На правым флангу дывізыі генэрала фон-Парыш заня[]лі насьля адбіцця французкіх контр-атакаў мейсцовасьці з Тонні—Сорні і ўзвышша паўночна-заходней Суассона. Пас[ь]ля заўзятаго бою войскі генэрала Нікура зламалі спраціу[]ленне ніпрыяцеля на ўзгорках Конд. Форт Конд быў захоп[]лены і узяты Врэньі і Нісей. На паудневым беразі р. р Эы і Вэль былі узяты узвышша захадней Сіры.

Корпусы генэралаў фон-Вінклера, фон-Конта і фо[н] Шметтова перайшлі р. Вель і ўзялі Брэзо і Фім. Мы зна[]ходзімся на ўзвышшах паудневей р. Вель.

Войскі герэрала Эльзэ заўладалі ўзвышшамі паўночна ўсходней Пэндтл і ўзялі Франкю і Гэрэ ды змагаюцца з[а] ўзвышшы Цірры.

За без перестанку йдучымі ўпярод пехатою, артылерыя[й] і мінакідчыкамі, сьледуюць лятуны, газавікі і войскі зьвязі. Прадукцыйная праца сапёрных, жалезнадарожных рабочых [і] будаўнічых атрадаў палягчае здоленне поля бітвы і падвоз[]ку баевага снараджэння, дзякуючы без перастання працую[]чым абозам; дохтары і санітары даглядаюць раненых на пол[і] бітвы с самаахвярнасьцю.

Нігледзючы на зьменчывую пагоду нашыя лятуны бе[з] перастанку нападаюць на ворага з бомбамі і куляметамі, у той час як пяхотныя і артылерыйскія лятуны карэктуюць [і] накіроўваюць наш напад і дзейнасьць артылерыйскаго агню.

Лічба палонных дайшла да 23.000 сярод іх адзін французкі і адзін ангельскі генэралы.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Вячэрні адчот:

Міжы Суассонам.і Рэймсам новыя усьпехі.

Бюро Вольфа.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Выдача цукру па новых бонавых кніжках па 2 фунты на порцыю адбудзецца, дзеля формальных прычын, троху пазднеі 1-го чэрвеня, дзеля таго што прасіцелеу аб перамені №№ бонавых крам бонавае бюро адсылае да 5-го чэрвеня.

Пакуль што па 1/4 ф. цукру на душу выдаецца па старых бонавых картках.

Усе думскія пастановы ад часоу пераварату і выбрання новай думы па сягоняшні дзень запатрэбаваны новым меськім галавою Хржонстоуским дзеля азнаемлення і прагляду ужо выпоуненых з іх і ні выпоуненых.

Эвакуацыя афіцэрау, ідучы пляномерна паменьшыла лік асоб карыстаюшчыхся афіцэрскім прыпынкам у памешканні духоунай сэмінарыі ад 275 чал. толькі на 80.

Лік сталуючыхся у афіцэрскіх сталоуках, у сэмінарыі і пры бюро (Петропаулоуская, 59,—дзякуючы эвакуацыі, упау с 800 на 390 чал.

Усяго да сягоняшняго дня эвакуіравано у акупаваныя мейсцы і у Расію, а так-сама Фінляндзію, па весткам афіцэрскаго бюро, 2480 чал. с сямействамі.

Пасьля 1-го чэрвеня, г. з. па аканчанні паверачнай рэгістрацыі, гэтыя лічбы яшчэ болей паменьшаюць.

Рээвакуацыя у Літву, часова прыпыненая, ад 1-го чэрвеня, як паведамляе літоускі камітэт уцекачоу, пачнецца зноу.

Каталіцкае сьвята „Божаго Цела" адсьвяткавалося таржэсьцвено у тутэйшых касьцелах учора, 30 мая.

З гэтай прычыны крэстны ход адлажылі на нядзелю, 2 чэрвеня.

Гастролі нямецкаго тэатру «Усходні фронт» пачаліся у меськім тэатры ад серады, 29 мая.

Еурэйская труппа перабралася з меськаго тэатру у Камэрны тэатр.

Епархіальны зьезд духоунікоу і міран, намечаны у Менску у пачатку чэрвеня, адкладваецца на нівядомы час, глаунае дзеля браку почты і матэрыяльных срэдствау, дзеля таго што тутэйшы сьвечны склад, на чыі грошы зьезды наогул сазываліся, цяпер сам чуць трымаецца.

Упраулениe нямецнаго ваеннаго паліцмэйстэра, перашэушы ад учэрайшаго дня у памешканне б.—штаба міліцыі уступіло ва усю поунату сваіх прау і абавязкау к міліцыі, якая цяпер ужо ні тычыцца меськаго самаупраулення карыстаецца толькі субсідыей.

Нікаторым з б. паліцэйскіх чыноу, служачых да перавароту, у прыемі на службу па міліцыі адказано.

Інспэктарам крымінал-паліцыі пры паліцмэйстрэ лічыцца Хэпнер, служыушы до акупацыі краю у мейсцовым районным скураным камітэці.

Усе працаздольныя мушчыны і кабеты, без вядомаго заняцця, павінны да 1-го чэрвеня зарэгістравацца у караульнай свайго міліцэйскаго вучастку дзеля атрымання работы.

Ні явіушымся, ні прыняушым яе ні будуць выдаваць харчоваго пайка.

Гэта распараджэнне выходзіць ад нямецкай камэндантуры.

Менскае Консульство Украінскай дзержавы паведамляе, што сягоння, 31 мая, а 6-ай гадзіне раніцай, адпрауляецца на Украіну с Віленскаго вакзала эшалон запісаушыхся афіцэрау, дохтароу, чыноунікау, сясьцер міласэрдзія і салдат: усе павінны явіцца а 4-ай гадз. раніцай.

Ніявіушыяся трацюць права на паек, выезд і выключаюцца з рэгістрацыонных спіскау.

Курсы беларусазнаўства.

31 мая лекцыя 1. Грыба: «Нашыя песьняры».

Пачатак а 7 гадз.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.